*А. Г. Цымбал*
Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт, Мінск

*A. Tsimbal*
Minsk State Linguistic University, Minsk

**УДК 94(476)(045)**

# «КРЭСОВАЯ» ПАРАДЫГМА Ў ПОЛЬСКАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ: ЭВАЛЮЦЫЯ МІФА І ДАСЛЕДЧЫХ СТЭРЭАТЫПАЎ

# «KRESY» PARADIGM IN THE POLISH HISTORIOGRAPHY: EVOLUTION OF THE MYTH AND RESEARCH STEREOTYPES

*«Крэсовая» парадыгма з'яўляецца фундаментальнай мадэллю даследавання, глыбока ўкаранёнай у польскай гістарыяграфічнай традыцыі. Міф «Крэсаў» – ключавы элемент польскай нацыянальнай ідэнтычнасці, які вызначае стэрэатыпы і асаблівасці напісання гісторыі Беларусі. У той жа час сёння назіраецца актыўная крытыка «крэсовага» дыскурсу і выказваюцца меркаванні вызначаць дадзеныя тэорыі як мульцікультурнае пагранічча ў якасці замены тэрміна «Крэсы».*

*Ключавыя словы: гістарычны міф; Крэсы; Беларусь; посткаланіяльны дыскурс; мульцікультурнае памежжа.*

*«Kresy» paradigm is a fundamental model of research which is deeply rooted in the Polish historiography tradition. The «Kresy» myth is an essential element of Polish national identity and defines certain research stereotypes and features of the history writing. Criticism of «Kresy» discourse actively sounds at present time and the scholars make suggestions to define these areas as a multiethnic and multicultural borderland as a substitute for the concept of «Kresy».*

*Key words: historical myth; Kresy; Belarus; postcolonial discourse; multicultural borderland.*

Даследаванне гісторыі Беларусі даўно перастала быць выключнай прэрагатывай беларускіх гісторыкаў. Шматлікія аспекты і праблемы гісторыі беларускіх зямель сталі аб'ектам вывучэння гістарычнай навукі суседніх краін. Цяжка сёння ўявіць даследаванне, якое б не ўлічвала дасягненні замежнай гістарыяграфіі, у прыватнасці Польшчы, з якой Беларусь аб'ядноўвае шматвяковая агульная гісторыя. У той жа час у айчыннай гістарыяграфіі практычна адсутнічаюць спецыяльныя даследаванні, прысвечаныя асаблівасцям фарміравання парадыгмальных уяўленняў польскай гістарычнай навукі, якія непасрэдна закранаюць гісторыю Беларусі. Малавядомымі застаюцца навуковыя погляды і канцэптуальныя мадэлі, з дапамогай якіх ствараецца вобраз Беларусі ў польскай гістарыяграфіі. Яшчэ менш мы ведаем аб дыскусіях у асяроддзі польскіх гісторыкаў, якія датычацца беларускіх зямель. Дадзены артыкул прысвечаны вывучэнню

аднаго з фундаментальных падыходаў польскай гістарыяграфіі – «крэсовай» парадыгме, а таксама звязаных з ёй даследчых стэрэатыпаў.

У польскай культуры паняцце «Крэсы» належыць да гістарыяграфіі, паліталогіі і іншых сфер. Дадзенае вызначэнне ўсходніх тэрыторый Польшчы зарадзілася ў перыяд падзелаў і адсутнасці дзяржаўнасці, а пазней атрымала шырокае распаўсюджванне пасля атрымання незалежнасці, калі міфалагічны вобраз гісторыі знайшоў сваю рэалізацыю ў дзяржаве і грамадстве. Паняцце «Крэсаў» моцна ўкаранілася ў калектыўных уяўленнях насельніцтва Польшчы, нягледзячы на тое, што на сённяшні дзень 9 з 10 палякаў нарадзіліся пасля 1945 г., гэта значыць, у сучасных граніцах Польшчы, і ніколі не жылі на «Крэсах». Праведзенае ў 2007 г. даследаванне паказала, што 52,2 % грамадзян Польшчы лічаць «Крэсы ўсходнія» польскімі землямі. У гэтай лічбе палову складалі асобы ва ўзросце менш за 29 год, якія нарадзіліся ці выраслі пасля 1989 г. [1, с. 3] «Крэсы» з’яўляюцца адным з галоўных элементаў гістарычнай памяці палякаў. У іх гістарычным разуменні «Крэсы» сталі міфічнымі тэрыторыямі, аб якіх неабходна памятаць, але да якіх вяртання ўжо няма. Міфалагічны і ідэалізаваны вобраз польскіх усходніх зямель са шматлікімі стэрэатыпнымі ўяўленнямі быў закладзены, у тым ліку, гістарычнай літаратурай. Сучасная польская гістарыяграфія ў значнай ступені працягвае трансляваць «міф польскіх Крэсаў».

У побытавым разуменні міф уяўляецца казачнай гісторыяй, непраўдзівай і выдуманай. З’яўленне міфа абумоўлена неабходнасцю зразумець рэчаіснасць. Заблытаны навакольны свет ці яго аспекты дзякуючы міфу набываюць сэнс і парадак, даступны да разумення і апанавання. Міф выконвае важныя сацыяльныя функцыі. Прыняцце міфа спрыяе ўсведамленню сувязі з членамі группы, на падставе міфа будуецца ўласная ідэнтычнасць [2, с. 31]. У сучасным грамадстве міфалагізацыя выконвае выключна значную ролю, бо самаідэнтыфікацыя чалавека адбываецца заўсёды на падставе міфалагізаванага мыслення. Для шырокіх колаў грамадства гісторыя прадстае ў міфалагізаваным выглядзе. Міф як форма сацыяльнай свядомасці засноўваецца на адпаведных сувязях у калектыўнай памяці. Неабходнай умовай для пераўтварэння калектыўных ведаў у міф з’яўляецца яго папярэдняе ўкараненне ў грамадскай свядомасці [3, с. 8], таксама міф абапіраецца на веру, у выніку чаго не падлягае верыфікацыі.

Міф выступае як характэрная для пэўнай культурнай групы наратыўная праекцыя сэнсу яе існавання. Гісторыі, якія ўваходзяць у склад міфа, надаюць падзеям парадыгмальнае значэнне, якое часта выражаецца ў рэлігійных катэгорыях. Гісторыя «Крэсаў» нагадвае працэс канструявання ўяўленай супольнасці ў адпаведнасці з канцэпцыяй Б. Анрэрсана. Міф становіцца асновай разумення сацыяльнай групы, з’яўляецца ўяўленай ідэнтычнасцю, якая дзякуючы веры ў яе становіцца праўдзівай. Міфалагізацыя мыслення з’яўляецца неад’емнай часткай гістарычных даследаванняў і напісання

гісторыі [4, с. 253]. З гэтай перспектывы належыць глядзець на праблематыку міфалагізацыі ўсходніх тэрыторый II Рэчы Паспалітай і ўплыву міфатворчай ролі памяці на фарміраванне паняцця «Крэсы» як нейкага сімвалічна-геаграфічнага края, які існуе ў гістарычнай памяці [5, с. 281].

Паняцце «Крэсы» паходзіць ад старажытных прыгранічных вайсковых застаў на Падоллі ва Украіне, але з цягам часу паняцце пачалі атаясамліваць з усімі ўсходнімі тэрыторыямі Рэчы Паспалітай. Менавіта «Крэсы ўсходнія» трывала замацаваліся ў гістарычнай памяці Польшчы. Найбольш старажытны «крэсовы» стрэрэатып паўстаў у XV ст., калі татарскія напады пагражалі Еўропе, а ўсходнія тэрыторыі разглядаліся як «аплот хрысціянства», дзякуючы чаму ўжо у той час гэтыя тэрыторыі пачалі набываць сакральнае значэнне [6, с. 94].

Пачынальнікам міфа «Крэсаў» як усходніх рубяжоў Рэчы Паспалітай лічыцца паэт эпохі рамантызму Вінцэнт Пол, які ў 1854 г. выдаў літаратурны твор «Магорт», дзе ўпершыню было выкарыстана і вызначана паняцце «Крэсаў». У фарміраванне вобраза «Крэсаў» велізарны ўклад быў зроблены творчасцю Г. Сянкевіча. У наратыве «Крэсаў» вялікую ролю адыгрываў сармартызм – шляхецкая ідэалогія, распаўсюджаная з XVII ст., адпаведна якой «сапраўдным палякам» лічыўся размаўляючы па-польску каталік, які змагаецца «за Бога, Волю і Айчыну». «Крэсы» тут увасаблялі міф заснавання польскага народу, часткай якога разглядаліся таксама гістарычныя русіны і ліцвіны, якія ўсе разам змагаюцца з язычнікамі і маскоўскай схізмай. Ідэя «аплоту хрысціянства» цесна звязвалася з распаўсюджваннем уплываў Рыма-каталіцкай царквы [7, с. 48].

Да пачатку XX ст. адбылося пашырэнне семантыкі паняцця «Крэсаў» як «страчаных тэрыторый» ці «адабраных тэрыторый». «Крэсы» ўвасаблялі палітычны міф Польшчы, якая дзякуючы патрыятызму і «боскаму промыслу» павінна была зноў адрадзіцца [7, с. 48].

У польскай гістарыяграфічнай традыцыі «Крэсы» выступаюць як спецыфічны геаграфічна-палітычны край, сентыментальнае для палякаў паняцце, нейкая квінтэсенцыя польскасці, выразам чаго з’яўляюцца шматлікія альбомы, успаміны, дыярыўшы вандроўнікаў і перасяленцаў. У той жа час «Крэсы» як агульны тэрмін атаясамліваецца з перыферыяй, пагранiччам. Пад «крэсовымі» землямі разумеюцца Украіна, Беларусь і Літва, ці часткі тэрыторый, якія ўваходзілі ў склад усходніх ваяводстваў II Рэчы Паспалітай. Перыферыйнасць крэсаў як пагранічча вызначаецца культурна, эканамічна і палітычна развітым цэнтрам. Адносіны «цэнтр – перыферыя» выступаюць як адносіны ўлады, цэнтр заўсёды атаясамліваецца з развіццём, матэрыяльным багаццем, прэстыжам і інавацыйнасцю [8, с. 12]. Польскія навукоўцы прапануюць наступныя характарыстыкі «Крэсаў»: «Значная аддаленасць гэтых тэрыторый ад цэнтру дзяржавы, іх перыферыйнасць у адносінах да цэнтраў улады, інтэнсіўнай гаспадаркі, жывой культуры, значная ступень

геаграфічнай недасяжнасці і своеасаблівая дзікасць» [8, с. 18]. «Крэсы» ў такім разуменні выступаюць як выключна палонацэнтрычны падыход у гісторыі і ацэньваюцца з перспектывы польскай нацыі і дзяржаўнасці. Дадзены погляд з'яўляецца прыкладам этнацэнтрычнага гістарычнага дыскурсу.

У рамках вызначанай мадэлі міфалагізацыі падпадалі ўзаемаадносіны нацыянальных супольнасцей на «Крэсах». Ствараўся вобраз неканфліктных стасункаў, якія набывалі патранімічныя рысы і дзе знікалі класавыя адносіны. Польскі пан выступаў добрым гаспадаром і абаронцам, а беларус, украінец ці літовец – селянінам, якога выхоўваў па лепшым узоры шляхціч. Мясцовае насельніцтва, якое патрабавала апекі, выступала аб'ектам цывілізацыйнай місіі, якая стала яшчэ адным стэрэатыпам польскай гістарыяграфіі «Крэсаў» [9, с. 76].

Падобны каланіяльны характар канцэпту «Крэсаў» ўпісваецца ў посткаланіяльны дыскурс. Яны выступаюць для палякаў як выраз польскай магутнасці ў часы Рэчы Паспалітай «ад мора да мора», сімвал польскага імперыялізму, настальгіяй аб залатым веку Польшчы, калі яна была актыўным іграком на міжнароднай арэне. Міф асабліва ўзмацніўся ў часы дзяржаўнага і эканамічнага крызісу, пасля якіх Рэч Паспалітая патрапіла пад уплыў Расіі і ў выніку была ліквідавана. У выніку Польшча ў гістарыяграфіі выступае як ахвяра. Час Рэчы Паспалітай на фоне пазнейшых крызісаў прадстаўляецца ў гістарыяграфіі як час польскай імперыі, час гордасці і шляхецтва [10, с. 34]. Характэрна, што нават у найбольш цяжкія перыяды польскай гісторыі з свядомасці палякаў, асабліва з публічнай прасторы, не знікла перакананне ў «вялікай Рэчы Паспалітай», да якой належалі «крэсовыя» землі [11, с. 96]. Гэтыя ідэі знайшлі працяг у ІІ Рэчы Паспалітай [12, с. 96], дзе некаторыя палітычныя сілы дабіваліся для Польшчы каланіяльнага статусу, разглядаючы гэта за права кожнага суверэннага народа [13]. У працэсе кансалідацыі польскай нацыянальнай ідэі міф крэсаў выконваў інтэгратыўную і тэрапеўтычную функцыі, ідэалізаваў жыццё шляхты, легендарнае мінулае і гераізм у абароне ад «чужых».

Стэрэатыпам для польскай гістарыяграфіі «Крэсаў» сталі таксама ўяўленні аб «чужых», пагрозе тых, хто не ўпісваўся ў «крэсовую» ідылію і выступаў як здрайца і разбуральны элемент. Нацыянальныя рухі меншасцей ІІ Рэчы Паспалітай у гэтым кантэксце разглядаліся як інспіраваныя Расіяй. Такі падыход не дапускаў магчымасці польскай віны [6, с. 102]. Роля «чужых» таксама адводзілася камуністам і яўрэям [7, с. 52; 14].

Даследчыкамі адзначаецца, што сутнасцю дыскусіі паміж федэрацыйнай і інкарпарацыйнай канцэпцыямі адраджэння ІІ Рэчы Паспалітай з'яўлялася не пытанне, як далёка павінны сягаць усходнія граніцы Польшчы, але якія павінны былі быць адносіны да незалежнасці Беларусі, Літвы, Украіны і нацыянальных меншасцей усходніх тэрыторый ІІ Рэчы Паспалітай. Рост нацыянальных рухаў прыводзіў да ўсведамлення палітычнай чужасці

ўсходніх тэрыторый. У дадатак да пачуцця рэальнай пагрозы з боку бальшавісцкай Расіі ўсё гэта стварала добры грунт для ідэі Польшчы як «бастыёну заходнееўрапейскай цывілізацыі». У гэтым кірунку развівалася ідэя праметэізму – падтрымкі незалежнасці не рускіх народаў СССР і палітычная канцэпцыя Міжмор'я [7, с. 50–52].

У міжваенны перыяд міф «Крэсаў» выконваў ролю аплоту хрысціянства, гэтым разам у абароне перад бальшавікамі і нацыянальнымі меншасцямі, якія імкнуліся да эмансімацыі, у тым ліку шляхам узброенай барацьбы. Акрамя легенды маршала Ю. Пілсудскага і польска-савецкай вайны, менавіта «Крэсы» сталі цэнтральным міфам, які ляжаў у фундаменце II Рэчы Паспалітай [15, с. 294].

Змены граніц пасля II Сусветнай вайны і масавыя перасяленні, у дадатак да ўсталявання савецкага рэжыму ў Польшчы, прывялі да істотных змен у даследаванні «Крэсаў». У Польшчы настальгічны погляд у пасляваенны перыяд фактычна зышоў у падполле, і толькі заходняя эміграцыя працягвала дэманстраваць зведаную крыўду. Гэта сітуацыя спрыяла міфалагізацыі пытання, прадстаўлення яго аднабока, праз дамінацыю эмоцый над рацыянальнымі аргументамі. Патрабаванне вяртання граніц да 1939 г. было пазначана ў палітычнай праграме польскага ўрада ў Лондане да 1980-х гг. Але ў Парыжскай «Культуры» Е. Гедройца быў прапанаваны новы падыход да Украіны, Літвы і Беларусі, які адкідваў настальгію і сентыменталізм і прапаноўваў «актыўную памяць». Ю. Мерашэўскі, сааўтар ідэі, пісаў: «Ягелонская ідэя толькі для нас не ўяўляе нічога агульнага з імперыялізмам, але для беларусаў, літоўцаў і ўкраінцаў з'яўляецца чыстай формай традыцыйнага польскага імперыялізму» [16]. Сутнасцю падыходу з'яўлялася прымірэнне са стратай «Крэсаў» пры адначасовай культывацыі крэсовых традыцый, прызнанні іншых нацыянальных груп і дзяржаўных імкненняў Беларусі, Літвы і Украіны.

У самой Польшчы ў афіцыйнай гістарычнай навуцы паняцце «Крэсы» знаходзілася ў фактычнай забароне да 1989 г. У выніку вобраз «Крэсаў» фарміраваўся дзякуючы дысідэнцкай літаратуры, мастацкім творам і сямейным нарацыям. Міфалагізацыя знаходзіла ўвасабленне ў творчасці перасяленцаў, у той час як афіцыйная навука да 1989 г. фактычна захоўвала маўчанне адносна гісторыі ўсходняй граніцы Польшчы, атаясамліваючы набытыя землі на захадзе з этнічнай Польшчай Пястаў і супрацьпастаўляючы яе Польшчы Ягелонаў, накіраванай на ўсход як экспансіі на землі этнічна не польскія [17, с. 35].

Пасля 1989 г. «Крэсы» пачалі вяртаць страчаныя пазіцыі ў гістарыяграфіі і грамадскім жыцці. Зняцце афіцыйных табу спрыялі разблакіроўцы і аднаўленню міфатворчай ролі паняцця. Пачынаецца новы ўсплеск успамінаў, сентыменталізацыі і ідэалізацыі «Крэсаў», якія ўпісваюцца ў ідэалагічныя і палітычныя нарратывы. Адбываецца рост цікавасці да польскай дыяспары за ўсходняй мяжой. Асаблівы інтарэс выклікаюць тэмы, якія былі

забаронены цэнзурай: устанаўленне савецкай улады ў Заходняй Беларусі ў 1939–1941 гг., дэпартацыі і рэпрэсіі на былых усходніх тэрыторыях II Рэчы Паспалітай, праследаванні і рэпрэсіі адносна польскага насельніцтва на тэрыторыях савецкіх рэспублік у міжваенны перыяд [18–20].

Дыскусіі вакол «крэсовай» парадыгмы разгортваюцца праз два вызначальныя працэсы: сакралізацыя і дэміфалагізацыя. Можна казаць аб пачатку стварэння альтэрнатыўнага вобраза «Крэсаў», у якім прысутнічае не толькі гісторыя Польшчы, але і суседніх краін. Усё большую папулярнасць набываюць канцэпты Цэнтральна-Усходняй Еўропы, шматэтнічнага і шматкультурнага паграніччa, рэгіёну сутыкнення візантыйскага Усходу і каталіцкага Захаду. Выказваюцца сумненні ў пазнаваўчай каштоўнасці «крэсовага» дыскурсу. Французскі гісторык Д. Бовуа, які займаўся даследаваннем сацыяльных адносін на «Крэсах», паставіў пытанне аб неабходнасці ліквідацыі «міфа Крэсаў усходніх». Па яго меркаванні, даўно наспеў час адмовіцца ад гэтага паняцця. Аўтар падкрэслівае, што годнасць усходніх суседзяў Польшчы неабходна паважаць і нельга іх разглядаць толькі як перыферыю Польшчы, нават калі гэта было гістарычна абгрунтавана, калі Беларусь, Украіна і Літва былі часткай Рэчы Паспалітай, але гэта было несправядліва, бо нейкай гармоніі і шматкультурнасці ніколі не існавала [6]. Аб неабходнасці адкінуць міф, што нібыта «Крэсы» былі землямі культурна польскімі, піша і Я. Сова [21, с. 324].

У той жа час застаецца распаўсюджаным погляд аб «знішчэнні Крэсаў» Расіяй ці СССР, неабходнасці пашырэння ведаў аб іх польскасці. Абгрунтоўваецца неабходнасць стварэння музея Крэсаў [22]. Такі падыход уласцівы для кансерватыўных поглядаў у польскім палітычным і публічным дыскурсе. Лічыцца, што памяць аб польскіх крэсах з'яўляецца патрыятычным абавязкам, а «Крэсы» адыгрываюць ключавую ролю ў канструкцыі польскай нацыянальнай ідэнтычнасці. Адмова ад паняцца «Крэсы» разглядаецца як фальсіфікацыя гісторыі і штучнае змяншэнне ролі польскага элементу на Усходзе. Спробы замены «крэсовага» дыскурсу на канцэпт паграніччa сутыкаюцца з абвінавачваннямі ў служэнні замежным інтарэсам [23, с. 403]. Цэлы шэраг навуковых і папулярна-навуковых выданняў, публіцыстыкі, новых таварыстваў, якія аб'ядноўваюць выхадцаў з «Крэсаў», сведчыць аб новай хвалі гларыфікацыі польскага ўплыву на Усходзе. Ствараюцца энцыклапедыі «Крэсаў» [24] і навукова-папулярныя выданні і альбомы [25], прысвечаныя прадстаўленню «Крэсаў» як «калыскі польскасці, у якой з дапамогай не толькі агня і мяча, але і плуга выкоўвалася тое, што некаторыя даследчыкі пачалі называць польскай душой» [26, с. 7]. Шмат увагі надаецца Беларусі, але з пункту гледжання захавання польскай спадчыны [27; 28].

Б. Бакула акрэслівае памяць аб «Крэсах» як паварот да ідэалізаванага вобраза тэрыторый, як посткаланіяльнае вяртанне памяці, адабранай імперскім цэнзарам [29]. Назва «Крэсы» была і з'яўляецца паланізуючым

фактарам, які сёння ахвотна выкарыстоўваецца палякамі і выклікае абразу ў беларусаў, літоўцаў і ўкраінцаў. У гэтым сэнсе «крэсовы» дыскурс з'яўляецца палемічным і дыскусійным, выступае выразам правоў і ўласнасці і, такім чынам, становіцца дыскурсам улады. Праяўляецца ён, напрыклад, у спрэчках аб палітычнай ідэнтычнасці крэсовых тэрыторый, этнаграфічнай структуры, культурнай спадчыне.

Такім чынам, «крэсовая» парадыгма з'яўляецца фундаментальнай мадэллю даследавання, якая глыбока ўкаранёна ў польскай гістарыяграфічнай традыцыі. Міф «Крэсаў» выступае істотным элементам польскай нацыянальнай ідэнтычнасці і вызначае пэўныя стэрэатыпы і асаблівасці гістарыяпісання. У выніку значная частка сучасных навукоўцаў, ангажаваных у кансерватыўны грамадскі і палітычны дыскурс ці фактычна стаўшых закладнікамі існуючых акадэмічных традыцый, створаных гуманітарнай навукай, працягваюць трансляваць гістарычна зададзеныя схемы даследаванняў. З другога боку, сёння ўсё часцей гучыць крытыка «крэсовага» дыскурсу і выказваюцца прапановы вызначэння гэтых тэрыторый як шматэтнічнага і мульцікультурнага пагранічча ў якасці замены паняцця «Крэсаў».

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Kresy Rzeczypospolitej. Wielki mit Polaków / Polityka. Pomocnik historyczny. – Warszawa: Polityka, 2016. – 180 s.

2. *Kulczycki, M.* Mity w życiu człowieka / M. Kulczycki // Polskie mity polityczne XIX i XX wieku; red. W. Wrzesiński. – Wrocław 1994. – S. 11−33.

3. *Wrzeciński, W.* Polska mitologia polityczna XIX i XX wieku / W.Wrzeciński // Polskie mity polityczne XIX i XX wieku; red. W. Wrzesiński. – Wrocław 1994. – S. 93−106.

4. *Topolski, J.* Historiografia jako tworzenie mitów i walka z nimi / J. Topolski // Ideologie, poglądy, mity w dziejach Polski i Europy XIX i XX wieku. Studia historyczne / pod red. J. Topolskiego. – Poznań, 1991. – S. 243–254.

5. *Jakimowicz, M.* Mit kresów wschodnich – pomiędzy historią a pamięcią / M. Jakimowicz // Наук. Зап. Нац. Ун-ту «Острозька академія». Серія Культурологія. – 2015. – Вип. 16. – С. 279–293.

6. *Beavois, D.* Mit «kresów wschodnich», czyli jak mu położyć kres / D. Beavois // Polskie mity polityczne XIX i XX wieku; red. W. Wrzesiński. – Wrocław 1994. – S. 94.

7. *Klesmann, C.* Kresy i niemiecki Wschód / C. Klesmann, R. Traba // Polsko-niemieckie miejsca pamięci ; red. Robert Traba, Hans Henning Nahn. – Warszawa: Wydawnictwo Naukowe Scholar, 2012. – T. 3. Paralele – S. 41–72.

8. *Koter, M.* Kresy państwowe – geneza i właściwości w świetle doświadczeń geografii politycznej / M. Koter // Kresy-pojęcie i rzeczywistość. Zbiór studiów; red. K. Handke. – Warszawa, 1997. – S. 9–52.

9. *Главінскі, Т.* Забыты гарнізон. Аддзелы Корпуса аховы памежжа ў Івянцы ў 1924–1939 гадах / Т. Главінскі; пер. з пол. мовы А. Пілецкага. – 2-е выд. – Смаленск: Інбелкульт, 2015. – 142 с.

10. *Zarycki, T.* Polska i regiony a debata postkolonialna / T. Zarycki // Oblicze polityczne regionów Polski; pod red. M.Dajnowicz. – Białystok: Wyższa Szkoła Finansów i Zarządzania, 2008. – S. 31–48.

11. *Dąbrowski, M.* Kresy w perspektywie krytyki postkolonialnej / M. Dąbrowski // Porównania. – 2009. – № 5. – S. 91–111.
12. *Wapiński, R.* Mit dawnej Rzeczypospolitej w epoce porozbiorowej / R. Wapiński // Polskie mity polityczne XIX i XX wieku; red. W. Wrzesiński. – Wrocław 1994. –S.77–92.
13. *Borkowska, G.* Polskie doświadczenie kolonialne / G. Borkowska // Teksty Drugie. – 2007. – № 4. – S. 15–24.
14. *Cała, A.* Żyd wróg odwieczny. Antysemityzm w Polsce i jego źródła / A. Cała. – Warszawa: Wydawnictwo Nisza, 2012. – 868 s.
15. *Kosman, M.* O kresach w historii i legendzie. Studia i szkice z dziejów polskiej granicy wschidniej / M. Kosman. – Poznań: Wydawnictwo naukowe WNPiD UAM, 2014 . – Część II. – 295 s.
16. ULB czyli «Kultura» i Mieroszewski. – Режим доступа: http://www.kresy.pl/publicystyka?zobacz/ulb-czyli-kultura-i-mieroszewski. – Дата доступа: 01.02.2017.
17. *Kosman, M.* O kresach w historii i legendzie. Studia i szkice z dziejów polskiej granicy wschidniej / M. Kosman. – Poznań: Wydawnictwo naukowe WNPiD UAM, 2014. – Część I. – 192 s.
18. *Wierzbicki, M.* Polacy i Białorusini w zaborze Sowieckim. Stosunki polsko-białoruskie na ziemiach północno-wschodnich II Rzeczypospolitej pod okupacją sowiecką 1939–1941 / M. Wierzbicki. – Warszawa: Volumen, 2000. – 336 s.
19. *Iwanow, M.* Pierwszy naród ukarany: Polacy w Związku Radzieckim 1921–1939 / M. Iwanow. – Warszawa–Wrocław: Państwowe Wydawnictwo Naukowe, 1991. – 399 s.
20. *Ziółkowska, E.* Kuropaty – Cmentarzysko Polskich Ofiar Sowieckiego Terroru / E. Ziółkowska // Biulety Instytutu pamięci narodowej. – 2009 – № 1–2. – S. 44–54.
21. *Sowa, J.* Fantomowe ciało króla. Peryferyjne zmagania z nowoczesną formą / J. Sowa. – Kraków: Wydawnictwo Universitas, 2011. – 572 s.
22. *Winicki, Z. J.* «Kresy Wschodnie» – funkcjonowanie pojęcia i realiów we współczesnej Polsce. Dlaczego niezbędnie jest Muzeum Kresów Rzeczypospolitej? / Z. J. Winnicki // Kresowe Dziedzictwo. Studia nad językem, historią i kulturą; pod red. Anny Burzyńskiej-Kmienieckiej. – Wrocław, 2012. – S. 45–53.
23. *Hadaczek, B.* Historia literatury kresowej / B. Hadaczek. – Kraków: Universitas, 2011. – 454 s.
24. Encyklopedia Kresów. – Kraków: Wydawnictwo Kluszczyński, 2004. – 560 s.
25. *Dylewski, A.* Kresy. Historia, ludzie, tradycje / A. Dylewski, M. Koprowski. – Warszawa: SBM Renata Gmitrzak, 2013. – 368 s.
26. *Koprowski, M.* Kresy w II Rzeczpospolitej / M. Koprowski. – Wydawnictwo: SBM, 2014. – 128 s.
27. *Koprowski, M.* Kto niszczy Polskość na Białorusi / M. Koprowski. – Warszawa: Biblioteka Wolności, 2015. –211 s.
28. *Śleszynski, W.* Kresy Wschodnie czyli Białoruś Zachodnia. Historia, współczesność, pamięć / W. Śleszynski. – Łomianki, 2013. – 166 s.
29. *Bakuła, B.* Kolonialne i postkolonialne aspekty polskiego dyskursu kresoznawczego (zarys problematyki) / B. Bakuła // Teksty Drugie. – 2006. – № 6. – S. 11−33.

**(Дата падачы: 20.02.2017 г.)**